FREE BELARUS MUSEUM

# Стратэгія развіцця Музея Вольнай Беларусі

2026 — 2028

Варшава, 2026

# Змест


Уводзіны 3

1. Дзейнасць Музея Вольнай Беларусі 5

1.1 Гісторыя Музея Вольнай Беларусі: у пошуках ідэнтычнасці 6

1.2 Місія Музея Вольнай Беларусі 13

2. Музейныя калекцыі і навуковая дзейнасць 17

2.1 Асноўныя прынцыпы фарміравання музейных калекцый. Палітыка набыцця, дакументавання і прадстаўлення доступу да музейных прадметаў 18

2.2 Навуковая апрацоўка фондаў 20

2.3 Захоўванне музейных калекцый – актуальныя праблемы і спосабы іх вырашэння 21

3. Экспазіцыйная і выставачная дзейнасць 22

3.1 Арганізацыя музейнай прасторы. Часовыя і пастаянныя музейныя экспазіцыі 23

3.2 Выставачная дзейнасць 23

4. Віртуальная прастора і інтэрактыўныя рашэнні ў дзейнасці музея 25

5. Аўдыторыя музея 27

6. Партнёрства і супрацоўніцтва. Апякунская Рада 30

7. Эканамічная мадэль функцыянавання музея 33

8. Маніторынг 35

9. Заключэнне 37

# Уводзіны

FREE BELARUS MUSEUM

Створаны ў ліпені 2022 года Музей Вольнай Беларусі за час свайго існавання стаў значнай і ўнікальнай з’явай у палітры беларускіх арганізацый, вакол якіх кансалідуецца дэмакратычна і нацыянальна арыентаваная частка беларусаў замежжа.

Вымушаны існаваць у эміграцыі, Музей імкнецца выконваць некалькі функцый адначасова, займаючыся музеефікацыяй гісторыі пратэстнага, дэмакратычнага і нацыянальна-вызвольнага руху беларусаў, арганізуючы шматлікія выставы і культурныя мерапрыемствы, а таксама прадстаўляючы сваю пляцоўку для шматлікіх культурніцка-асветніцкіх, грамадскіх і палітычных мерапрыемстваў.

Зменлівасць умоваў функцыянавання Музея, накіраванасць на дынамічнае развіццё і ўстойлівасць патрабуюць ад яго эфектыўнай адаптацыі пад грамадска-палітычную і культурніцкую сітуацыю, што пануе ў беларускім грамадстве і ў краіне перабывання.

З мэтай пошуку ўстойлівых форм развіцця, была распрацаваная гэтая Стратэгія, разлічаная на два наступныя гады. Рэалізацыя палажэнняў і рэкамендацый Стратэгіі забяспечыць далейшую эвалюцыю гэтай прадстаўнічай і эксклюзіўнай культурнай установы.

1

# Дзейнасць Музея Вольнай Беларусі

FREE BELARUS MUSEUM

## 1.1 Гісторыя Музея Вольнай Беларусі: у пошуках ідэнтычнасці

Музей Вольнай Беларусі паўстаў як праект у асяродку беларускай эміграцыі ў Варшаве на мяжы 2021-2022 гадоў. Ініцыятарамі яго стварэння сталі кіраўнік Народнага антыкрызіснага упраўлення, экс-міністр культуры Рэспублікі Беларусь, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Павел Латушка і супрацоўніца НАУ, былая начальніца ўпраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталля Задзяркоўская. Ад самага пачатку функцыянавання Музея, яго мэтай заяўлялася музеефікацыя гісторыі беларускіх пратэстаў супраць дыктатуры Аляксандра Лукашэнкі ў 2020 годзе і іншых звязаных з гэтым падзей беларускага дэмакратычнага руху.

У сакавіку 2022 года ініцыятыва атрымала ў арэнду памяшканні ў гістарычным будынку на вуліцы Фоксаль, 11 у Варшаве, якія займае і цяпер. Гэтыя памяшканні складаюцца з аднаго працоўнага кабінета, адной Выставачнай залі плошчай 100м2, музейнага пакою, кабінету для афіцыйных мерапрыемстваў і прыёмаў а таксама тэхнічных памяшканняў (сутарэнне, дзве каморы, санвузел, памяшканні балконнага тыпу з ускладнёным доступам). Дадатковыя арганізацыйныя магчымасці Музею дадае наяўнасць двух дворыкаў у будынка па Фоксаль, 11.

У ліпені 2022 года адбылося ўрачыстае адкрыццё Музея, было шырока аб'яўлена пра місію новай культурнай ініцыятывы, прагучалі заклікі да камплектавання калекцыі намаганнямі грамадскасці. У гэты час калекцыя Музея пачала напаўняцца першымі артэфактамі, колькасць якіх да канца 2022 года склала каля 10 экспанатаў, сярод якіх – сукенка “БЧБ-нявесты” Іны Зайцавай, агітацыйныя матэрыялы, дакументы, асабістыя рэчы з пратэстаў 2020 года, творы мастацтва.

5 траўня 2023 года Музей стаў самастойнай юрыдычнай асобай і функцыянуе цяпер як афіцыйна зарэгістраваная ў Польшчы недзяржаўная грамадская арганізацыя Асацыяцыя “Музей Вольнай Беларусі”.

Ад пачатку свайго існавання Музей сканцэнтраваўся на актыўным удзеле ў культурным і грамадска-палітычным жыцці беларускай дыяспары ў Варшаве, арганізуючы па некалькі дзясяткаў мерапрыемстваў у год і прымаючы каля 9-ці тысяч наведвальнікаў. На яго пляцоўках разгортваюцца як буйныя праекты фестывальнага фармату, так і камерныя мастацкія ініцыятывы, што стала магчымым дзякуючы добра адаптыўнай прасторы. Падчас арганізацыі мерапрыемстваў прад'яўляюцца высокія патрабаванні да якасці арганізацыі, прамоцыі, суправаджэння. Адначасова, Музей ад пачатку свайго існавання сутыкаецца з відавочнымі інстытуцыянальнымі праблемамі ў сваім развіцці, паколькі колькасць пастаянных супрацоўнікаў на дадзеным этапе абмяжоўваецца 2-3 адзінкамі персаналу. Асноўнымі каналамі камунікацыі Музея з аўдыторыяй становіцца Instagram акаўнт, таксама выкарыстоўваецца старонка ў Facebook, функцыянуе сайт freebelarus.museum.

На працягу 2022-2023 гадоў Музей Вольнай Беларусі ажыццявіў інвентарызацыю наяўнай калекцыі, якая склала 81 экспанат. Канцэпцыя фармавання калекцыі пераважна захоўваецца ранейшая – артэфакты 2020 году, але пачынаюць дадавацца таксама экспанаты, што адлюстроўваюць лёс беларускіх палітзняволеных і ўдзел беларускіх добраахвотнікаў у абароне Украіны супраць поўнамаштабнай расійскай агрэсіі.

З мэтай развіцця ўстановы, пошуку шляхоў яе найбольш эфектыўных форм дзейнасці, у канцы 2023 года па ініцыятыве Музея Вольнай Беларусі быў праведзены навукова-практычны семінар «Музейная рэфлексія аб палітычных трансфармацыях і спрэчнай памяці: перспектывы рэпрэзентацыі ў кантэксце Беларусі». На ім былі сфармуляваныя некалькі галоўных высноў адносна актуальнага стану Музея і перспектыўных накірункаў яго развіцця. Ніжэй пададзеныя гэтыя пазіцыі, а таксама іх актуалізацыя па выніках на канец 2025 года.

Музей Вольнай Беларусі ўжо сёння выказвае сябе як шматфункцыянальны культурна-асветніцкі і навукова-дакументацыйны асяродак беларусаў у Польшчы, які, акрамя выключна музейных задач (збор, дакументаванне і захаванне матэрыялаў пра беларускі дэмакратычны рух), выконвае функцыі культурна-камунікатыўнай прасторы, месца, дзе фарміруецца і ўмацоўваецца беларуская ідэнтычнасць, адбываюцца розныя сустрэчы і культурныя імпрэзы, сацыяльна-палітычныя і навуковыя дыскусіі, прэзентацыі, тэатральныя і мастацкія пэрфомансы.

Музей, аднак, узнік і існуе ў польскім культурным асяроддзі, якое так ці інакш уплывае на яго. Каб не стаць цэнтрам «беларускага гета», музей павінен інтэгравацца ў навакольны кантэкст, ствараючы прадукт, які быў бы цікавы не толькі беларускай, але і польскай публіцы. Чым больш будзе расцягвацца так званы «эміграцыйны перыяд» для беларусаў, тым большае значэнне будзе набываць гэта інтэграцыйная павестка ў дзейнасці музея як на інстытуцыянальным, так і на канцэптуальным узроўні.

Для часткі беларусаў па-ранейшаму патрэбен будзе «свой дом» у Варшаве, так званае "месца сілы" і культурнай памяці, якое яны палічаць важным захаваць для сваіх дзяцей і сябе. Таму ідэя музея, які б існаваў і як праваобраз будучай інстытуцыі ў Беларусі, і як самастойны беларускі музеялагічны праект у Варшаве, набывае ўсё большую каштоўнасць.

Нягледзячы на тое, што Музей Вольнай Беларусі ўзнік і працягвае існаваць як шматфункцыянальная культурная пляцоўка, пра што сведчыць юрыдычны статус установы, музейная складаючая яго дзейнасці (камплектаванне і захаванне матэрыялаў пра гісторыю дэмакратычнага руху беларусаў, выставачная дзейнасць) з'яўляецца прыярытэтнай, што неаднойчы падкрэслівалася яго кіраўніцтвам. Аднак для ажыццяўлення менавіта музеялагічнага накірунку інстытуцыі неабходна правесці шэраг істотных змен у сваім працоўным раскладзе, распачаўшы актыўную работу па ўліку і інвентарызацыі музейных прадметаў, фармаванню калекцый, абсталяванню фондасховішча, архівацыі даных і інш. Неабходна таксама падумаць пра інстытуцыянальную ўстойлівасць, забяспечыўшы

паслядоўнае фінансаванне і кваліфікаваны штат супрацоўнікаў. Усё гэта магчыма пры ўмове яго далейшай легалізацыі менавіта як музейнай установы на падставе польскага заканадаўства.

Па выніках працы навукова-метадычнага семінара, на замову Музея была распрацавана Канцэпцыя развіцця (канец 2023 г.), якая выступае зараз як праграмны дакумент установы.

Разглядзім, як складваецца сітуацыя з пытаннямі, вынесенымі ў якасці ключавых выклікаў для Музея на бягучы момант.

Музей як шматфункцыянальны культурна-асветніцкі і навукова-дакументацыйны асяродак.

На дадзены момант колькасныя і якасныя паказчыкі дзейнасці Музея дэманструюць, што ўстанова сапраўды выступае як важная для жыцця дыяспары шматфункцыянальная культурная пляцоўка і з'яўляецца адметным суб'ектам культурнага працэсу ў жыцці беларускай грамадскасці ў Польшчы і наогул у замежжы.

Так, за 2023 год на пляцоўках установы прайшло каля 150 культурна-адукацыйных мерапрыемстваў, яе наведвальнікамі сталі каля 9 000 чалавек. У 2024 і 2025 гадах гэтыя паказчыкі захаваліся на тым жа ўзроўні. У 2026 годзе Музей ажыццяўляе рэгістрацыю наведвальнікаў і на момант публікацыі дадзенай Стратэгіі колькасныя паказчыкі набліжаліся да 750 – 850 чалавек у месяц.

У 2024 годзе Музей выступаў арганізатарам такіх мерапрыемстваў, як Ноч Музеяў, выстава “Несціхаючыя галасы”, “Алесь Пушкін. Afterlife”, “Сукенкі за свабоду”, прэзентацыя кнігі У. Някляева “Без Айчыны” і шматлікія іншыя. Таксама Музей выступаў суарганізатарам наступных мерапрыемстваў: фестываль кніжнай прадукцыі “Pradmova”, фестываль відэа- і кінафільмаў “Bulbamovie”, спектаклі Купалаўскага і Свабоднага тэатраў, святкаванне Дня Волі і інш.

За 2025 год Музей захаваў і нарасціў набраны раней тэмп, арганізаваўшы і прыняўшы ўдзел у такіх мерапрыемствах, як фестываль вулічнага кіно “Нямая ліхаманка”, выстава памяці Алеся Пушкіна, “Fragmenty” (абраныя экспанаты з калекцыі Музея), “Нічога асабліва новага” (рэчы, гісторыі, творчасць палітвязняў), “Пяць артэфактаў і толькі адна ноч” (На Ноч музеяў), Лявона Тарасевіча “Ідэнтычнасць” у межах Варшаўскага галерэйнага ўікенда, фестываль кніжнай прадукцыі “Pradmova” і інш.

Такім чынам, адна з ключавых роляў Музея, вызначаная ў праграмных дакументах установы – функцыянаваць у якасці важнага для культурнага жыцця дыяспары цэнтра рэалізацыі ініцыятыў, выконваецца. У Музеі праводзяцца маштабныя мерапрыемствы, якія з'яўляюцца падзеяй на культурным ландшафце беларускай Варшавы. Музей супрацоўнічае з ключавымі грамадскімі ініцыятывамі дыяспары, прадстаўляе памяшканні і арганізуе свае ўласныя мерапрыемствы і выставы, што збіраюць шырокія колы наведвальнікаў. Установа таксама трымае планку як пляцоўка для высокарангавых сустрэч і мерапрыемстваў палітычных эліт беларускай эміграцыі.

У якасці стратэгічнай задачы бачыцца неабходнасць захавання і развіцця таго ўзроўню падрыхтоўкі і рэалізацыі мерапрыемстваў, які быў дасягнуты за першыя гады працы. Зразумела, што акрымя захавання актуальнага стану, установа павінна імкнуцца да новых здзяйсненняў і ўзроўняў. Дасягненне далейшага росту можа быць абумоўлена развіццём арганізацыйнага патэнцыялу, для чаго патрабуецца павелічэнне штатнай колькасці, мадэрнізацыя і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Трэба адзначыць, што гэты працэс развіцця арганізацыйнага патэнцыялу адбываецца тут і цяпер, пра што будзе сказана ніжэй.

Вялікае значэнне для далейшага развіцця Музея мае таксама магчымасць пашырэння і паляпшэння адведзеных пад установу памяшканняў. Вялікая колькасць грамадскіх мерапрыемстваў часам можа ўступаць у супярэчнасць з выкананнем установай спецыфічных музейных функцый, што заўсёды назіраецца пры спалучэнні рознахарактарных форм дзейнасці на абмежаванай плошчы.

Таму, для паспяховага вырашэння ўсіх актуальных задач установы стратэгічнай мэтай бачыцца пошук магчымасцяў для павелічэння колькасці памяшканняў, адна частка з якіх выконвала б выключна музейныя функцыі, другая частка – прадстаўнічыя, а трэцяя частка магла б выкарыстоўвацца для правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў.

Музей у польскім культурным асяроддзі.

Канцэпцыя развіцця Музея прадугледжвае, што ён будзе рухацца ў накірунку бачнасці не толькі для дыяспары, але таксама для прадстаўнікоў іншых культур і ў прыватнасці для польскіх наведвальнікаў.

Рух у гэтым накірунку адбываецца, мэтанакіраваная дзейнасць праводзіцца, прыкладам чаго з'яўляюцца ініцыятывы па правядзенні выставаў польскіх мастакоў у памяшканнях музея. Гэтая актыўнасць, адначасова з іншымі, можа спрыяць працэсу паяўлення і замацавання Музея Вольнай Беларусі на культурнай мапе Варшавы.

Дзеля наладжвання лепшай камунікацыі з польскім грамадствам Музей правёў у 2025 годзе даследаванне аўдыторыі, уключыўшы ў кола рэспандэнтаў прадстаўнікоў польскага грамадства.

Стратэгічная мэта Музея пры гэтым – функцыянаваць як прастора, што знаёміць польскую (і наогул замежную) аўдыторыю з актуальнай сітуацыяй у Беларусі і з беларускай культурай наогул. З гэтай мэтай у Музеі была створана пастаянная зменная выстава з новых экспанатаў "Кропка ўваходу", задача якой заключаецца ў знаёмстве з актуальнай сацыяльна-палітычнай і культурнай сітуацыяй у Беларусі. Аднак, для дасягнення падобнай стратэгічнай мэты, патрабуецца развіццё экспазіцыйных магчымасцяў, а таксама не рэалізаваныя пакуль формы ўзаемадзеяння з польскай публікай. Гэта могуць быць усе тыя ж формы працы, што

рэалізуюцца зараз на беларускую аўдыторыю, толькі з фокусам на польскую публіку: экскурсіі, публікацыі на польскай мове, развіццё соцсетак, рэклама, калабарацыя з культурнымі і музейнымі ўстановамі, супрацоўніцтва з медыярэсурсамі і г.д.

Гэта важны і вялікі абём працы, які зараз не дазваляе рэалізаваць абмежаванасць Музея ў рэсурсах. Для выхаду на шырокую польскую аўдыторыю, такім чынам, Музею ў першую чаргу патрабуюцца дадатковыя спецыялісты, добра знаёмыя з аўдыторыяй.

Пры абмежаванні наяўных рэсурсаў, бачым неабходнасць у засваенні Музеем абавязковых практык, арыентаваных на польскую аўдыторыю. Як напрыклад:

- Выкарыстанне польскай мовы ў тэкставых матэрыялах, што суправаджаюць мерапрыемствы, выставы, музейныя экспазіцыі ўстановы.
- Фарміраванне кліентскай базы наведвальнікаў музея, як беларусаў так і палякаў, а таксама прадстаўнікоў іншых культур.
- Інфармаванне польскіх СМІ і праз польскія СМІ пра мерапрыемствы Музея.

Яшчэ адным спосабам прыцягнення польскіх наведвальнікаў можа стаць засваенне тэм, што хвалююць як беларускае, так і польскае грамадства – напрыклад, гэта могуць быць тэмы беларуска-польскай сумеснай гісторыі, жыцця беларускай дыяспары ў Польшчы а польскай у Беларусі і інш.

Ці выступае зараз Музей як “свой дом” для беларусаў у замежжы, як “месца сілы”?

Паводле дадзенай пазіцыі, адзначанай пры падрыхтоўцы Канцэпцыі музея і на навукова-метадычным семінары, Музею адводзіцца роля выступіць як блізкае, утульнае, інтымнае і роднае месца, у якім чалавек пачуваецца як на Радзіме. Адначасова, з якога беларус будзе чэрпаць натхненне і энэргію да жыцця.

Бачыцца, што правядзенне вялікай колькасці культурна-адукацыйных, грамадскіх мерапрыемстваў, арыентаваных на прадстаўнікоў беларускай дыяспары, спрыяе захаванню адзначаных функцый Музеем. У сценах установы прадстаўнікі розных пакаленняў (і, што важна – дзеці) часта бавяць час на забаўляльных актыўнасцях, адчуваючы тут добразычлівую і прыязную атмасферу, што дазваляе Музею быць уключаным у асабістыя, суб’ектыўныя перажыванні наведвальнікаў.

Палепшыць успрыняцце ўстановы ў межах суб’ектыўнага вопыту маглі б таксама дадатковыя сямейна-арыентаваныя мерапрыемствы, што праводзіліся б на рэгулярнай аснове – клубы па інтарэсах і ініцыятывы для вольнага часу (напрыклад, музейныя заняткі для дзетак, Клуб калекцыянераў, бібліятэка і інш.). Рэалізацыя падобных форм актыўнасці, аднак, патрабуе дадатковых рэсурсаў.

Ажыццяўленне менавіта музеялагічнага накірунку інстытуцыі – паводле прапаноў, выказвалася пажаданне правесці шэраг істотных змен у працоўным раскладзе, распачатку актыўнай работы па ўліку і інвентарызацыі музейных прадметаў, фармаванню калекцый, абсталяванню фондасховішча, архівацыі даных і інш.

Трэба адзначыць, што музеялагічны складнік у працы ўстановы прасочваецца на працягу яе існавання – ажыццяўляўся збор і калекцыянаванне музейных прадметаў, адбывалася афармленне рэгістрацыйнай дакументацыі, праводзілася каталагізацыя артэфактаў, была створана экскурсія па Музеі, вялася праца па напаўненні музейнага пакою набыткамі, што адлюстроўваюць профіль Музея Вольнай Беларусі.

Многія з артэфактаў маюць выключнае значэнне ў працэсе музеефікацыі гісторыі беларускага супраціўлення дыктатуры А. Лукашэнкі і салідарнасці беларускага народа з Украінай ва ўмовах расійскай агрэсіі.

Аднак, трэба адзначыць, што ў Музеі на дадзены момант адсутнічае: 1) патрэбным чынам абсталяванае фондасховішча; 2) электронная сістэма ўліку для каталагізацыі прадметаў музейнага значэння, якая б адпавядала стандартам дзяржаўных музеяў. Бачыцца, што гэта можа стаць перашкодай для інтэграцыі Музея Вольнай Беларусі ў польскую музейную сістэму, калі на гэта будзе ўзяты накірунак у будучыні.

Рэалізацыя музеялагічнага накірунку ўстановы сутыкаецца, аднак, з шэрагам выклікаў, што носяць аб'ектыўны і цяжка пераадольны характар. На дадзены момант Музей Вольнай Беларусі размяшчаецца ў памяшканнях, якія не прыстасаваныя для захоўвання прадметаў музейнага значэння, а на балансе арганізацыі адсутнічае неабходнае для гэтага абсталяванне. Будынак па вуліцы Фоксаль 11, у якім Музей арандуе плошчу, з'яўляецца помнікам культуры, пагэтаму тут не дазваляецца перапланіроўка памяшканняў. Наяўныя пакоі не дазваляюць арганізаваць фондасховішча з забеспячэннем неабходнага тэмпрэтатурна-вільготнаснага рэжыму. Гэта з'яўляецца істотнай перашкодай у рэалізацыі музейных функцый установай, аднак яна можа быць пераадоленая ў выпадку распрацоўкі комплексу замяшчальных мерапрыемстваў. Напрыклад, гэта можа быць арэнда іншых памяшканняў, перадача музейных прадметаў у фондасховішчы іншых музеяў, выкарыстанне шафаў і вітрын з клімат-кантролем і інш.

Далей. У 2024 годзе Музей Вольнай Беларусі атрымаў інстуцыянальную падтрымку, што дазволіла яму павялічыць штат і ўзмацніць працу над напаўненнем і рэпрэзентацыяй калекцыі, а таксама мець пастаяннага спецыяліста па знешняй камунікацыі.

Дзякуючы гэтаму, за 2024-2025 гады калекцыя Музея павялічылася да 400 артэфактаў. Назіраецца рост аўдыторыі ў сацыяльных медыя. Быў распрацаваны новы поўнафункцыянальны сайт у даменнай зоне “museum” – freebelarus.museum. Частка калекцыі (200 экспанатаў) была алічбаваная ў адпаведнасці з патрабаваннямі Міністэрства культуры

Польшчы і прадстаўлена ў вольным доступе на сайце і перададзена ў электронную базу даных Нацыянальнага Інстытута Музеяў Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча.

Таксама на гэтым этапе Музей пачынае пашыраць тэматычныя і часавыя межы сваёй калекцыі, уключаючы ў яе экспанаты, якія адлюстроўваюць гісторыю барацьбы беларускага народа за незалежнасць і дэмакратыю. Так, Музей Вольнай Беларусі набыў артэфакт 1773 года, вядомы як "Сакрэтны ліст берасцейскага ваяводы", дакументы XIX стагоддзя, звязаныя з падзеямі паўстання 1830 г. і іншыя экспанаты.

На дадзены момант Музей Вольнай Беларусі мае калекцыю артэфактаў, якая тэматычна засяроджаная на трох асноўных тэмах і блізкіх да іх – гэта рэчы з пратэстаў 2020 і іншых гадоў, рэчы беларускіх палітвязняў і рэчы беларусаў – удзельнікаў вайны ва Украіне.

У адпаведнасці з праграмай інстытуцыянальнай падтрымкі, разлічанай да рэалізацыі да сярэдзіны 2027 года, Музей плануе стварыць тры тэматычныя калекцыі: Калекцыя «Артэфакты беларускага пратэсту 2020», Калекцыя "Артэфакты, звязаныя з грамадска-палітычнымі падзеямі ў Беларусі, развіццём беларускага дэмакратычнага руху і грамадзянскай актыўнасці пасля 2021 года" і Калекцыя "Артэфакты (арыгіналы і копіі), звязаныя з гісторыяй беларускага дэмакратычнага руху з 1990-х гадоў".

Варта адзначыць, што Музей распачаў таксама дзейнасць па фарміраванні вакол сваёй інстытуцыі прафесійнай супольнасці беларускіх музейшчыкаў, што знаходзяцца ў эміграцыі. Гэта – ініцыятыва Беларуская музейная лабараторыя, якая пачала функцыянаваць у 2025 годзе і аб'яднала каля 30 спецыялістаў з розных краін свету (Польшча, Літва, Вялікабрытанія, Украіна, Германія, Іспанія). Музейная лабараторыя функцыянуе ў форме перыядычных офлайн і онлайн-сесій з экспертнымі выступленнямі і навучальнымі заняткамі для спецыялістаў.

У перспектыве, развіццё дзейнасці Музейнай лабараторыі можа зрабіць Музей Вольнай Беларусі галоўнай інстытуцыйнай пляцоўкай, якая рэпрэзентуе інтарэсы гэтай прафесійнай супольнасці і адначасова акумулюе яе рэсурсны і інтэлектуальны патэнцыял. Развіццё супрацы з польскімі музеямі можа ствараць канкрэтныя магчымасці для задзейнічання беларускіх музейшчыкаў у сумесных праектах – з магчымасцю афіцыйнага замацавання іх удзелу праз кантракты, стажыроўкі ці валанцёрскія праграмы. Такім чынам, Музей будзе выступаць не проста выставачнай прасторай, але і інстытуцыйным хабам, які яднае вакол сябе разрозненыя чалавечыя і інтэлектуальныя рэсурсы беларускай эміграцыі і ўбудоўвае іх ва ўстойлівыя праектныя рамкі.

Што да інстытуцыянальных магчымасцяў арганізацыі, дасягнутых за мінулыя тры гады развіцця.

На дадзены момант Музей Вольнай Беларусі ўкамплектаваны штатам супрацоўнікаў у сумарнай колькасці 4 стаўкі, якія займаюць 5 чалавек. Вакол інстытуцыі сфармавалася пастаяннае кола валанцёраў і партнёрскіх арганізацый (у першую чаргу, Беларуская асацыяцыя палітвязняў "ДаВолі"), узаемадзеянне і дапамога якіх дазваляе вырашаць задачы, што перавышаюць самастойныя магчымасці арганізацыі. Фінансавыя рэсурсы Музея

складаюцца з донарскай падтрымкі (каля 40%), грантавых праектаў (каля 50%) і ўласных даходаў (каля 10%). Існуючыя дамоўленасці і падпісаныя кантракты дазваляюць прагназаваць фінансавую ўстойлівасць у сярэднетэрміновай перспектыве (ад некалькіх месяцаў да года), а пры ўмове пашырэння крыніц фінансавання – і далейшае развіццё інстытуцыі.

Такім чынам, падсумоўваючы бягучы стан установы зафіксуем, што мадэль яе дзейнасці ўключае зараз тры асноўныя "прадукты" Музея, якія ўжо ёсць і будуць развівацца надалей:

Музей са сваімі калекцыямі і экспазіцыйнымі праектамі.

Культурніцкая, дыялогавая і прадстаўнічая пляцоўка.

Інстытуцыя для адукацыйных, даследвальніцкіх праектаў і архівацыі/дакументавання.

Улічваючы абмежаваныя рэсурсы ўстановы, Музеем плануецца ўнутраны маніторынг, для таго, каб вызначыць, што з бягучых справаў неабходна пакінуць і развіваць, а што – абмяжоўваць, бо нагрузка на каманду, гэта крытычна важны крытэр устойлівасці. У ідэале бачыцца пошук баланса паміж падзеямі, якія прыносяць людзей і партнёрства, і музейнасцю, якая патрабуе часу, цішы, рэсурсаў на інвентарызацыю і захоўванне.

## 1.2 Місія Музея Вольнай Беларусі

Паўстаўшы – як ужо было адзначана – ва ўмовах вымушанай эміграцыі як адзін з суб'ектаў пратэстнага руху і актараў дэмакратычных пераўтварэнняў у сучаснай гісторыі беларускага народу, будучы ад пачатку свайго заснавання глыбока афіляваным з палітычнымі арганізацыямі, місія Музея на першым этапе можа быць ахарактаразаваная як культурны супраціў.

Культурны супраціў – гэта форма супрацьстаяння ўладзе, гвалту, асіміляцыі або дамінуючай ідэалогіі праз культуру: мову, мастацтва, сімвалы, адукацыю, медыі, штодзённыя практыкі. Гэта супраціў, які працуе не (або не толькі) праз вулічную палітыку, а праз сэнсы: хто мы, як сябе называем, на якой мове гаворым, што памятаем і што лічым нармальным.

Такая місія Музея цалкам адпавядала актуальнай беларускай рэчаіснасці на момант інстытуцыянальнага афармлення ініцыятывы, стварэння ўласнай ідэнтычнасці арганізацыі.

У адпаведнасці з гэтай місіяй можа быць праінтэрпрэтаваная засяроджанасць Музея на арганізацыі мерапрыемстваў на першым этапе існавання. Іх высокі мастацкі і арганізацыйны ўзровень паўплывалі на фармаванне вакол інстытуцыі выразна акрэсленага кола зацікаўленай аўдыторыі, для якой з'яўляецца прымальным спалучэнне творчасці і палітычнага маніфеста.

Бачыцца, што на бягучым этапе місія культурнага супраціву захоўвае сваю актуальнасць для асэнсавання працы Музея, што прасочваецца ў тэматычным напаўненні мерапрыемстваў, праектаў і выстаў. Разам з тым, з працэсам фармавання вакол інстытуцыі сваёй аўдыторыі і партнёрскіх колаў, пачалі з'яўляцца новыя інтэрпрэтацыі той ролі, якую выконвае Музей у жыцці беларусаў замежжа.

Гэтая змена была асэнсаваная музейнымі спецыялістамі, якія падрыхтавалі для Музея Вольнай Беларусі ў 2023 годзе "Канцэпцыю развіцця". Вось як яна гучыць.

"Музей Вольнай Беларусі ў Варшаве – гэта музейны, культурны і адукацыйны цэнтр, які з'яўляецца домам для тысячы беларусаў, што вымушаны былі пакінуць радзіму з-за палітычных рэпрэсій. Гэта месца, дзе захоўваецца памяць пра беларускі дэмакратычны рух, пра грамадзянскі подзвіг нашых суайчыннікаў, якія ахвяравалі свабодай і жыццём за волю, чалавечую годнасць і еўрапейскі выбар.

Нашы дзверы адкрытыя для ўсіх і кожнага, хто падзяляе нашыя каштоўнасці. Мы імкнемся паглыбіць разуменне дэмакратычнага выбару, сённяшніх абставін і будучых магчымасцей, замацаваць тое, што нас вылучае як беларусаў і еўрапейцаў, садзейнічаць далейшай інтэграцыі ў еўрапейскую культурную прастору."

Такім чынам, місія Музея Вольнай Беларусі інтэрпрэтуецца праз ідэю "дома" для беларусаў у эміграцыі, што адначасова захоўвае памяць пра іх барацьбу за дэмакратычныя і еўрапейскія каштоўнасці і спрыяе еўрапейскай інтэграцыі.

Цалкам падтрымліваючы вышэйпададзенае вызначэнне місіі Музея, хочам засяродзіцца на некаторых акалічнасцях праекта "Музей Вольнай Беларусі", якія, на нашу думку, неабходна таксама ўлічваць падчас асэнсавання ўнікальнасці і самакаштоўнасці місіі гэтай інстытуцыі.

Па-першае, звяртае на сябе ўвагу той факт, што Музей Вольнай Беларусі з'яўляецца культурнай установай, канцэптуальна звязанай з феноменам беларускіх пратэстаў 2020 года, праз саму гісторыю ўстановы, праз яе калекцыйнае напаўненне і тэматыку мерапрыемстваў. Улічваючы, што нягледзячы на тое, што існуюць і іншыя ініцыятывы, тэматычна адданыя падзеям 2020 года, Музей на сённяшні дзень з'яўляецца адзінай арганізацыяй падобнага рода з афіцыйна зарэгістраваным статусам, што падкрэслівае яго ўнікальнасць у сузор'і беларускіх культурніцкіх ініцыятываў.

Падзеі 2020 года – гэта ў сваю чаргу ўнікальная з'ява ў гісторыі беларускага народа, якая можа быць праінтэрпрэтаваная як адлюстраванне яго гістарычнага шляху, экзістэнцыйнага і анталагічнага выбару на важным этапе дзяржаўнага і нацыянальнага станаўлення. З'ява, значная таксама і па маштабу тых цывілізацыйных зрухаў, якія яна справакавала ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, але пры гэтым якая стала вынікам выключна ўласна беларускіх фактараў.

Засяроджанасць на тэматыцы пратэстаў 2020 года і звязаных з імі падзей дазваляе, на нашу думку, пры дапамозе сродкаў музейнай інтэрпрэтацыі выйсці на больш шырокую тэматычную перспектыву, дэманструючы праз наяўныя калекцыі і выставачныя праекты Музея Вольнай Беларусі сацыяльна-палітычную, гістарычную, культурную карціну жыцця беларускага народа як у сучаснасці, так і ў гістарычнай перспектыве.

Па-другое, варта адзначыць, што ў бягучым выглядзе місіі Музея бракуе адной з важнейшых мэтаў, а менавіта – арыентаванасці на беларускую аўдыторыю не толькі ў эміграцыі, але і ў самой Беларусі. Нягледзячы на існаванне сучасных камунікацыйных перашкод і забарон, у доўгатэрміновай перспектыве бачыцца, што місія Музея павінна ўключаць прадстаўленне калекцыі беларусам у Беларусі, а таксама музеефікацыю прадметаў і з'яў, што паўстаюць у сучаснай Беларусі, дзеля будучыні ўсяго народа, незалежна ад месца пражывання асобных яго прадстаўнікоў. Менавіта ў гэтым бачыцца асноўнае стратэгічнае значэнне, якое адыгрывае Музей зараз і павінен адыгрываць у будучыні.

Па-трэцяе, варта мець на ўвазе, што місія Музея Вольнай Беларусі, як пляцоўкі за межамі Радзімы, павінна таксама ўключаць бачнасць для грамадства ў краіне пражывання, накіраванасць на рэпрэзентацыйную функцыю для людзей, не знаёмых з беларускай культурай. Адзначым, што дасягненню гэтых і іншых падобных задач будзе спрыяць пераход (альбо набліжэнне) на больш класічны варыянт музея, з маштабным папаўненнем фондаў экспанатамі высокай калекцыйнай і культурнай вартасці.

Існуючы як пляцоўка з шырокай функцыянальнасцю, Музей натуральным чынам аб'ядноўвае ў сабе розныя формы ўзаемадзеяння з аўдыторыяй, выступаючы як музей, выставачная зала, рэпетыцыйная база, прэзентацыйная і перагаворная пляцоўка, месца для правядзення фестываляў, спектакляў, паказаў, прэс-канферэнцый, форумаў, для арганізацыі творчых і адукацыйных заняткаў і сустрэч. Падобная шматфункцыянальнасць – характэрная рыса для многіх эмігранцкіх культурніцкіх арганізацый, у тым ліку музейнай накіраванасці.

Падобная шматвектарнасць мае свае і станоўчыя, і негатыўныя вынікі. Станоўчымі можна лічыць, напрыклад такія: гэта дае Музею шырокую і разнастайную аўдыторыю; спрыяе прыцягненню рэсурсаў праз запатрабаванасць і дае магчымасць дыверсіфікацыі праектных ініцыятыў. Негатыўнымі ж будуць: узрастанне нагрузкі на рэсурсную базу; распыленне ўвагі і працоўнага часу, што замінае засяродзіцца на ўласна музейнай дзейнасці. Але, нягледзячы на ўсе падобныя нязручнасці, выглядае, што гэтую частку сваёй місіі Музею проста неабходна прыняць як непазбежнасць.

Такім чынам, падсумоўваючы ранейшыя інтэрпрэтацыі місіі Музея, абапіраючыся на яго актуальны стан і ролю, выніковая фармулёўка з'яўляецца наступнай:

Місія Музея Вольнай Беларусі – захоўваць у актуальнай памяці беларускага народа гісторыю маштабных беларускіх пратэстаў 2020 года і звязаных з імі падзей; захоўваць памяць пра шматвекавую гісторыю барацьбы беларусаў за свабоду, дэмакратыю і супраць таталітарызму; выступаць як шматаблічны музейны, культурніцкі, сацыяльны і адукацыйны цэнтр беларусаў

у эміграцыі і іх сімвалічны дом; імкнуцца быць блізкімі і адкрытымі для беларусаў, што жывуць у Беларусі і не маюць магчымасці свабодна знаёміцца з актуальным станам незалежнага беларускага культурнага і гістарычнага наратываў; рэпрэзентаваць беларускую гісторыю і культуру для сваёй аўдыторыі і іншых аўдыторый у замежжы, дзеля інтэграцыі ў еўрапейскі і сусветны культурны працэс.

Укараненне музейнай місіі павінна прывесці да рэалізацыі пэўнай візіі Музея – якім ён будзе праз 2-3, 5-7 гадоў. Бачыцца, што інтуітыўна гэтая візія прасочваецца ў дзейнасці арганізацыі – Музей імкнецца да ўстойлівасці і баланса паміж магчымасцямі і жаданымі вынікамі. Мяркуем, што ўлічваючы сучасныя тэмпы развіцця ўстановы, можна арыентавацца на прырост асноўнай калекцыі Музея да 1 500 – 2 000 экспанатаў праз 2-3 гады, і да колькасці каля 4 000 – 5 000 экспанатаў праз 5-7 гадоў. Мэтай Музея з'яўляецца карысная адаптацыя наяўных памяшканняў, забеспячэнне функцыянавання падрыхтаванага фондасховішча, а таксама пастаянных экспазіцый, у тым ліку з гістарычнымі артэфактамі. Таксама ў доўгатэрміновай перспектыве можна прагназаваць атрыманне афіцыйнага музейнага статуса ў адпаведнасці з заканадаўствам краіны знаходжання, пашырэнне экспазіцыйных плошчаў і магчымасцяў захоўвання, усталяванне пастаянных партнёрскіх адносін з музейнымі інстытуцыямі ў краіне перабывання.

2

# Музейныя калекцыі і навуковая дзейнасць

FREE BELARUS MUSEUM

## 2.1 Асноўныя прынцыпы фарміравання музейных калекцый. Палітыка набыцця, дакументавання і прадстаўлення доступу да музейных прадметаў

Галоўным прынцыпам фарміравання калекцый Музея Вольнай Беларусі на момант яго заснавання быў клопат пра неабходнасць музеефікацыі артэфактаў беларускага пратэсту. Стыхійная творчая сіла беларускіх пратэстаў 2020 года пакінула пасля сябе мноства твораў мастацтва (як вулічнага, так і прафесійнага), матэрыяльных помнікаў грамадскага супрацьстаяння, якім пагражае мэтанакіраванае знішчэнне ў самой Беларусі, а таксама паступовае пагаршэнне стану з прычыны адсутнасці ўмоў захавання.

Збор калекцыі артэфактаў пратэсту 2020 года застаецца прыярытэтнай мэтай Музея. Дзеля развіцця дадзенай калекцыі ў канцы 2025 года Музей Вольнай Беларусі распачаў праект па эвакуацыі прадметаў музейнага значэння, звязаных з беларускім супраціўленнем дыктатарскаму рэжыму, што застаюцца ў Беларусі. Экспанаты, атрыманыя ў выніку гэтай працы, павінны стаць асновай калекцыі «Артэфакты беларускага пратэсту 2020 года».

Таксама, калекцыйны інтарэс Музея выклікаюць рэчы, тэматычна звязаныя з гісторыяй дэмакратычнага руху, розных форм барацьбы беларусаў за свабоду і дэмакратыю як у нядаўнім мінулым, так і ў сучаснасці. Гэта прадметы, звязаныя з дзейнасцю беларусаў унутры самой Беларусі (архівы партый, арганізацый, ініцыятыў і дзеячоў; матэрыялы з электаральных кампаній; матэрыялы, накіраваныя на інфармаванне насельніцтва; матэрыяльныя сведчанні палітычнага, грамадскага, сацыяльнага і культурнага жыцця і інш) і за яе межамі. Асабліва гэта адносіцца да прадметаў, звязаных з барацьбой прадстаўнікоў беларускага народа на стратэгічным узроўні – супраць рэгіянальнай пагрозы, што сыходзіць ад рэваншысцкай і агрэсіўнай палітыкі кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі. Гэта асабістыя рэчы беларускіх добраахвотнікаў і валанцёраў, удзельнікаў абароны Украіны супраць расійскай агрэсіі, матэрыяльныя сведчанні вайны.

У поле зацікаўленасцяў Музея Вольнай Беларусі таксама ўваходзяць тыя прадметы, што жыва сведчаць пра траўматычны вопыт прадстаўнікоў беларускага грамадства ў працэсе супрацьстаяння таталітарызму ва Ўсходняй Еўропе. Гэта асабістыя рэчы палітвязняў беларускага і іншых рэжымаў, дакументы, творы мастацтва.

Прынцыпам фарміравання музейных калекцый, такім чынам, які можна вылучыць на першым месцы, з'яўляецца імкненне выявіць і захаваць такія прадметы музейнага значэння, якім пагражае знішчэнне праз іх палітычнае гучанне і пагрозу для таталітарных рэжымаў, а таксама – якія маюць у сабе патэнцыял апавядання пра шлях беларусаў да свабоды і дэмакратыі. Прыярытэтам пры гэтым карыстаюцца артэфакты, якія паходзяць з беларускай рэальнасці.

Беручы пад увагу, што падзеі сучаснасці дэтэрмінаваныя ходам цывілізацыйнага працэса ўсяго рэгіёна Усходняй Еўропы і асаблівасцямі гістарычнага развіцця беларускага народа ў гэтым кантэксце, другім прынцыпам фарміравання калекцый Музея Вольнай Беларусі можна назваць імкненне рэпрэзентаваць сродкамі музейнай інтэрпрэтацыі асноўныя этапы гістарычнага працэса, які прывёў сённяшніх беларусаў у тую кропку, дзе яны знаходзяцца.

Вострае палітычнае супрацьстаянне, якое назіраецца ў грамадстве зараз, пераважна па лініі вертыкальнага супрацьстаяння, з элементамі каштоўнаснага непрыняцця, мае свае гістарычныя паралелі, якія могуць быць выяўленыя і адлюстраваныя ў зборах. Гэта могуць быць прадметы, звязаныя з дысідэнцкім рухам у часы СССР, з абвяшчэннем незалежнасці БНР і барацьбой за яе, рэчы і помнікі з часоў паўстанняў супраць расійскага панавання на землях былой Рэчы Паспалітай, а таксама прадметы, здольныя перадаваць еўрапейскі выбар і каштоўнасці беларускага народа, распавядаць пра яго супраціўленне дэспатызму, за якім часцей за ўсё на працягу стагоддзяў паўставалі сілы цэнтралізаваных суседніх дзяржаў.

Еўрапейскі цывілізацыйны вопыт беларускага народа, які праз стагоддзі застаецца моцнай прыцягальнай сілай для сучаснага беларускага грамадства, можа быць адлюстраваны ў музейных калекцыях таксама праз прадметы, напрамую не звязанымі з тэмай палітычнай барацьбы і супрацьстаяння. Гэта могуць быць артэфакты культуры і мастацтва, помнікі літаратуры і юрыдычнай думкі. Матэрыяльныя і духоўныя сведчанні старажытнасці, што ствараліся на беларускіх землях у працэссе нацыянальнага станаўлення і развіцця, альбо такія, што натхнялі і спрыялі цывілізацыйнаму росту нашых продкаў.

Палітыка набыцця прадметаў музейнага значэння для Музея Вольнай Беларусі павінна абапірацца на асноўныя прынцыпы фармавання калекцый і праследваць мэту напаўнення калекцый матэрыяламі рознага характару, стану, вартасці, унікальнасці, рэдкасці. Варта ўлічваць, што існуе шэраг прадметаў, якія могуць апынуцца па-за ўвагай іншых музеяў і калекцыянераў, але захаванне якіх неабходнае дзеля адлюстравання сучаснага стану беларускага грамадства, хоць самі яны могуць выклікаць уражанне незмястоўных, шараговых, аднолькавых. Напрыклад, гэта рэчы беларускіх палітвязняў ці ваяроў палка Каліноўскага, вулічныя ўлёткі, плакаты.

Акрамя збору артэфактаў вольнага бытнавання і доступу, у палітыцы набыцця прадметаў музейнага значэння варта таксама прадугледжваць мэтазгоднасць выяўлення каштоўнасцяў беларускага паходжання, наяўных на антыкварным рынку. Тыя з прадметаў, якія могуць падкрэсліць асаблівасці гістарычнага шляху беларускага народу і яго культуры, варта разглядаць як вартыя намаганняў па набыцці. Канчатковае рашэнне пра сур'ёзнасць гэтых намаганняў рэкамендавалася б складаць на падставе адпаведнасці асноўным прынцыпам фарміравання калекцый, а таксама мастацкай вартасці і ўнікальнасці артэфактаў для беларускай культуры.

Працэс набыцця прадметаў у музейную калекцыю патрабуе свайго адпаведнага дакументавання. Паколькі на дадзены момант Музей Вольнай Беларусі знаходзіцца на тэрыторыі Польшчы, мэтазгодна падчас распрацоўкі суправаджальнай дакументацыі

абапіраецца на рэкамендацыі Нацыянальнага Інстытута Музеяў Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча, якія абапіраюцца, у сваю чаргу, на еўрапейскі стандарт Spectrum 5.0.

Высокая сацыяльная значнасць калекцыі Музея Вольнай Беларусі прадугледжвае, што акрамя ўласна камплектацыі фондаў, палітыка ўстановы павінна прадугледжваць таксама прадастаўленне доступу шырокіх колаў грамадскасці да артэфактаў. Паколькі прадастаўленне прамога доступу можа быць звязана з рызыкамі што да захаванасці экспанатаў, прапануецца засяродзіць увагу і намаганні на стварэнні лічбавых копій і забеспячэнні доступа да іх. На дадзены момант Музеем Вольнай Беларусі пры падтрымцы Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча рэалізаваны праект “Лічбавізацыя і прадстаўленне доступу да калекцыі Музея Вольнай Беларусі”, у выніку чаго былі алічбаваныя 200 абраных артэфактаў. Бачыцца неабходнасць у працягу працэсу алічбоўкі, а таксама ў падтрымцы вольнага доступу да дыгіталізаванай калекцыі, а таксама ў размяшчэнні гэтых адлюстраванняў на ўстойлівых міжнародных музейных і архіўных пляцоўках.

Таксама варта адзначыць наступныя прынцыпы камплектавання фондаў, прымяненне якіх бачыцца абавязковым:

- забеспячэнне бяспекі і абарона асабістых даных;
- доказнасць і дакументаванне паходжання;
- павага да аўтарства;
- не-партыйнасць у музейных працэсах (незалежна ад наяўнасці палітычных партнёраў).

## 2.2 Навуковая апрацоўка фондаў

У штаце Музея Вольнай Беларусі на бягучы момант няма навуковых супрацоўнікаў, прафесійным абавязкам якіх з'яўлялася б навуковая апрацоўка прадметаў і калекцый.

Вядзенне дакументацыі, збор інфармацыі, рэгістрацыя і фіксацыя наратыўнай часткі ажыццяўляецца ў межах стандартных мерапрыемстваў па афармленні пратаколаў прыёму экспанатаў.

Магчымасці актывізацыі працы ў гэтым накірунку бачацца ў тым, каб ажыццяўляўся далейшы пошук інстытуцыянальнай падтрымкі, праектных праграм, варыянтаў супрацоўніцтва з зацікаўленымі інстытуцыямі, ініцыятывамі і даследчыкамі.

Адсутнасць выдзеленага навуковага супрацоўніка перашкаджае рэалізацыі такога важнага накірунка ў працэсе навуковай апрацоўкі фондаў, як збор сведчанняў (вуснай гісторыі). Хоць часткова гэтая праца ажыццяўлялася, але патрабуецца таксама распрацоўка методыкі збору сведчанняў, належная архівізацыя матэрыялаў.

У доўгатэрміновай перспектыве, з развіццём гэтага сегмента працы, бачыцца выхад на наступную візію:

- музей рэалізуе партнёрскую мадэль навуковага супрацоўніцтва, усталяваўшы сеткавае супрацоўніцтва з універсітэтамі/даследчыкамі;
- музей распрацоўвае ўласныя навуковыя прадукты: артыкулы, каталогі, адкрытыя лекцыі, вусная гісторыя, выпуск тэматычных зборнікаў.

## 2.3 Захоўванне музейных калекцый – актуальныя праблемы і спосабы іх вырашэння

На дадзены момант у Музея Вольнай Беларусі адсутнічае памяшканне, абсталяванае неабходным чынам як фондасховішча – з магчымасцю забеспячэння тэмпературна-вільготнаснага рэжыму і з сістэмай аховы.

Адаптуючыся да наяўных памяшканняў, калектыў Музея ажыццявіў кампенсатарныя мерапрыемствы, абсталяваўшы пад фондасховішча адно з памяшканняў. Гэтае памяшканне мае абмежаваны доступ, што дапамагае забяспечыць ахову экспанатаў, але толькі часткова. Таксама ў гэтым памяшканні немагчыма ажыццявіць неабходны комплекс мерапрыемстваў па кантролі за тэмпературай і ўзроўнем вільготнасці, а таксама па абароне экспанатаў ад уздзеяння святла.

На дадзены момант рашэнне праблемы з фондасховішчам з'яўляецца ключавым у пытанні забеспячэння захоўвання калекцый. Варыянтамі вырашэння сітуацыі, што склалася, могуць быць: арэнда дадатковых памяшканняў; заключэнне дамовы аб часовай перадачы фондаў у абсталяваныя для гэтага памяшканні іншых установаў.

Таксама, Музей мала забяспечаны неабходным абсталяваннем для захоўвання – спецыялізаванымі шафамі, стэлажамі, бескіслотнай паперай. Дзеля выпраўлення гэтай сітуацыі варта прадугледзець планаванне ўласных расходаў, а таксама ўдзел у конкурсных праграмах Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча а таксама еўрапейскіх фондаў, арыентаваных на падтрымку музейных ініцыятыў.

Рэкамендуецца таксама распрацаваць карту рызыкаў для асноўных тыпаў прадметаў (тэкстыль, папера, фарбы, лічбавыя носьбіты, прадметы з металу і г.д.) і зафіксаваць, што для іх з'яўляецца самым небяспечным фактарам (вільготнасць/святло/перапады тэмператур/шкоднікі). У адпаведнасці з гэтым, варта распрацаваць кампенсатарную праграму для забеспячэння захаванасці экспанатаў: спецыялізаваныя вітрыны, мінімальныя стандарты ўпакоўкі, бескіслотныя матэрыялы, базавы маніторынг вільготнасці/тэмпературы, інвентарызацыя, забеспячэнне кантролю доступу.

3

# Экспазіцыйная і выставачная дзейнасць

FREE BELARUS MUSEUM

## 3.1 Арганізацыя музейнай прасторы. Часовыя і пастаянныя музейныя экспазіцыі

Музей Вольнай Беларусі займае памяшканні агульнай плошчай каля 343 м2. Цэнтральная зала Музея мае плошчу каля 100 м2 і падрыхтаваная для арганізацыі і правядзення часовых выставаў і культурніцкіх мерапрыемстваў. Гэтая частка памяшканняў найбольш адаптаваная для зменных актыўнасцяў, працы з вялікімі аб'ёмамі і параўнальна вялікай колькасцю людзей. У бягучым моманце, пры захаванні сфармаванай праграмы мерапрыемстваў, не бачыцца магчымасцяў па стварэнні тут пастаяннай музейнай экспазіцыі.

Частковай мерай па фармаванні ўстойлівай экспазіцыі музейнага тыпу бачыцца адаптацыя памяшкання, што прымыкае да асноўнай выставачнай залі і адгароджана ад яе сцяной без уласнай столі. Бачыцца мэтазгодным абсталяваць гэтае памяшканне ўніверсальным комплексам вітрын і планшэтаў для магчымасці правядзення часовых музейных выставаў, альбо стварыць тут пастаянную экспазіцыю.

Таксама музей мае памяшканне, якое звычайна выкарыстоўваецца для правядзення афіцыйных сустрэч, прэс-канферэнцый і перамоваў. Пры немагчымасці адаптаваць яго пад музейную экспазіцыю, мэтазгодна было б разгледзець магчымасць размяшчэння тут яе часовых альбо пастаянных элементаў – мапаў, карцін, вертыкальных вітрын з экспанатамі.

Адно з памяшканняў Музея мае гібрыдную форму – гэта надбудова над тэхнічным памяшканнем, якая не мае пастаяннай ўваходнай групы, але такая група можа быць абсталяваная дадаткова. Пры правядзенні дадатковых мерапрыемстваў (напрыклад, пры пабудове лесвіцы з галерэяй), гэтае памяшканне можа быць выкарыстана як пад пастаянную экспазіцыю, так і пад фондасховішча, дзе можна было б забяспечыць неабходны тэмпературна-вільготнасны рэжым.

## 3.2 Выставачная дзейнасць

Выставачная дзейнасць Музея Вольнай Беларусі – адзін з самых паспяховых відаў дзейнасці на дадзеным этапе. Унікальная і прыцягальная нават па мерках Варшавы выставачная прастора, размешчаная ў помніку архітэктуры, што цудам ацалеў падчас Другой Сусветнай вайны, выклікае цікавасць і энтузіязм як у аўтараў праектаў, так і ў наведнікаў. Варта падкрэсліць, што апошнія нярэдка становяцца гасцямі Музея толькі дзеля знаёмства з архітэктурай будынка і ўнутраным аздабленнем, што спрыяе знаёмству з праектамі Музея неабазнаных у беларускай праблематыцы жыхароў і гасцей Варшавы.

Выставачная прастора добра адаптаваная да праектаў маштабнага памеру за кошт высокай столі, а адзінае абмежаванне, якое можа стрымліваць аўтараў – наяўнасць толькі адной залі. Выставачнае абсталяванне дазваляе размяшчаць мастацкія працы і іншыя музейныя

каштоўнасці на сценах і ў прасторы памяшкання. Тэхнічнае забеспячэнне Музея дазваляе наладзіць спецыялізаванае асвятленне і аўдыё- відэасуправаджэнне, але, безумоўна, удасканальванне гэтага накірунку можа адбывацца бясконца.

Выставачная дзейнасць Музея на дадзеным этапе мае выразны тэматычны падзел. Гэта выставачныя праекты сацыяльна-палітычнай накіраванасці (на тэматыку правоў чалавека, палітвязняў, вайны ва Украіне, рэпрэсій і пераследу ў Беларусі) і куратарскія праекты ў галіне сучаснага мастацтва.

Дадзены падзел ускладняе працу з фармаваннем пастаяннай аўдыторыі за кошт тэматычнага разрыву, што можа быць кампенсавана дадатковымі намаганнямі ў галіне прасоўвання, а таксама праз фармаванне пастаянных, брэндзіраваных праектаў. Трэба адзначыць, што амаль трохгадовы вопыт працы ўстановы сфармаваў шэраг пастаянных мерапрыемстваў, што могуць перарасці ў традыцыйныя і адметныя. Гэта, напрыклад, штогадовая выстава альбо сімпозіум, прысвечаная творчасці Алеся Пушкіна.

Вялікае значэнне ў павелічэнні пазнавальнасці Музея Вольнай Беларусі ў палітры выставачных пляцовак Варшавы мае ўдзел установы ў Варшаўскім галерэйным ўікэндзе. Станоўчы вопыт 2025 года, калі былі выстаўлены працы шырока вядомага і папулярнага ў Польшчы прадстаўніка беларускай меншасці Лявона Тарасевіча, паказвае накірунак, у якім варта рухацца і далей. Гэтая выстава дала магчымасць спалучыць у адным месцы беларускае і польскае, што безумоўна пашырыла магчымасці пазнавання беларускай культуры і беларускай сітуацыі прадстаўнікамі польскага грамадства. Мяркуем, што варта і надалей аддаваць увагу тэмам і аўтарам, здольным прыцягнуць на пляцоўку і беларускую, і польскую аўдыторыю. Шматвяковая супольная гісторыя двух народаў павінна даць дастаткова матэрыялу для выяўлення такіх тэм.

4

# Віртуальная прастора і інтэрактыўныя рашэнні ў дзейнасці музея

FREE BELARUS MUSEUM

Адна з складуючых місіі Музея Вольнай Беларусі – гэта захаванне блізкасці з людзьмі ў Беларусі. Такая блізкасць забяспечваецца на сучасным этапе перш за ўсё за кошт прадстаўленасці Музея ў віртуальным, лічбавым свеце.

У 2025 годзе Музей Вольнай Беларусі ажыццявіў праект "Лічбавізацыя і прадстаўленне доступа да артэфактаў", які меў на мэце менавіта перанос у лічбавую прастору важнейшых экспанатаў калекцый. Натуральна, што з павелічэннем музейных фондаў гэты працэс варта працягваць, а таксама шукаць іншыя, новыя формы прадстаўлення калекцыі ў віртуальнай прасторы.

Проста выстаўлены для ўсеагульнага азнаямлення артэфакт, аднак, можа мала прыцягнуць увагі, калі ён не суправаджаецца зразумелым, цікавым, уражлівым наратывам. Тэндэнцыі, якія назіраюцца ў свеце еўрапейскіх лічбавых рэпазіторыяў (напрыклад, Europeana, дзе праца з лічбавымі калекцыямі мае прыкметы ператварэння ў сацыяльную сетку) падказваюць, што вялікае значэнне будзе мець у будучым таксама далейшая праца з ужо адлічбаванымі калекцыямі – вакол іх могуць ствaрацца новыя наратывы, новыя формы ўзаемадзеяння з аўдыторыяй. Мяркуем, што ў гэтай сферы можа адкрыцца вялікае поле для перманентнай рэактуалізацыі прадстаўленых прадметаў, але гэта значная праца для прафесіяналаў з крэатыўным мысленнем.

Абмежаванасць выставачных магчымасцяў Музея Вольнай Беларусі дыктуе яму неабходнасць актыўна засвойваць мультымедыйныя варыянты рэпрэзентацыі ў адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі і рашэннямі ў музейнай справе.

Такім чынам, асноўнымі мэтамі развіцця віртуальнай прасторы Музея з'яўляюцца:

- бяспечная прысутнасць для людзей у Беларусі;
- бачнасць у свеце;
- архіўнае захаванне.

Акрамя ўласна лічбавізацыі эртэфактаў, віртуальная прастора Музея можа таксама ўключаць:

- анлайн-выставы;
- віртуальнае прадстаўленне "гісторыі прадметаў";
- адукацыйныя модулі/урокі.

5

# Аўдыторыя музея

FREE
BELARUS
MUSEUM

На бягучы момант аснову аўдыторыі Музея Вольнай Беларусі складае шырокая група беларусаў замежжа, што праяўляюць высокую ступень грамадскай адказнасці і актыўнасці. Штогадова Музей прымае на сваіх пляцоўках некалькі дзясяткаў мерапрыемтсваў, наведвальнікамі якіх становяцца па некалькі тысяч чалавек.

Абсалютная большасць аўдыторыі офлайн паводле назіранняў – гэта беларусы ў эміграцыі, якія сочаць за мерапрыемствамі і прыходзяць, адгукаючыся на абвесткі і навіны, размешчаныя ў беларускіх незалежных СМІ. Частку аўдыторыі офлайн прадстаўляюць беларусы з Беларусі, якія ведаюць пра існаванне Музея і цікавяцца яго працай, альбо якіх прыводзяць на пляцоўку родныя і сябры. Таксама некаторую частку аўдыторыі складаюць прадстаўнікі польскага грамадства і госці Варшавы з іншых краін, якія выказваюць цікавасць да незнаёмай для іх беларускай культуры.

Аўдыторыю, якая фізічна наведвае Музей, такім чынам, можна падзяліць на некалькі груп. Улічваючы, што ў розных груп розныя асабістыя інтарэсы і матывацыі, праца з аўдыторыяй таксама павінна мець розныя формы.

Беларусы ў эміграцыі. Праца з гэтай аўдыторыяй бачыцца ў адпаведнасці з місіяй і асноўнымі накірункамі дзейнасці Музея: быць для іх другім домам і цэнтрам сілы, забяспечваць актуальныя культурныя патрэбы, каб не забывалі сваю культуру і мелі магчымасць перадаваць яе дзецям. Для забеспячэння патрэбаў гэтай катэгорыі наведвальнікаў, варта ўлічыць магчымасць распрацоўкі асобнай "Адукацыйнай і моладзевай праграмы", арыентаванай на аўдыторыю розных узростаў і патрэб. Акрамя забеспячэння актуальных культурных патрэб беларусаў у эміграцыі, Музей можа стаць таксама тым месцам, дзе маладыя людзі беларускага паходжання будуць шукаць і знаходзіць сваю культурную і гістарычную прыналежнасць – і гэта, магчыма, адна з найбольш доўгатэрміновых місій, якую ўстанова можа ўзяць на сябе.

Беларусы ў Беларусі. Праца з гэтай аўдыторыяй патрабуе ў першую чаргу адпаведнасці абавязковым стандартам бяспекі, якія ўключаюць: кантроль за недапушчэннем несанкцыянаванага збору інфармацыі па наведвальніках з боку трэціх асобаў; апавяшчэнне пра рызыкі і меры бяспекі, якія неабходна прыняць наведвальніку (не размяшчаць інфармацыю ў соцсетках, наклейваць пазнаку “No foto” і падобнае). Таксама трэба ўлічваць асаблівыя інтарэсы гэтай часткі аўдыторыі. Музей Вольнай Беларусі можа выступаць для іх як выспа культурнай свабоды, дзе яны могуць пазнаёміцца з тэмамі, не дазволенымі ў сённяшняй Белврусі. Ім важна будзе пры гэтым разумець і адчуваць, што ўразлівая і знікаючая катэгорыя нацыянальных гісторыка-культурных каштоўнасцяў назапашваецца тут і знаходзіцца пад надзейнай абаронай. Праца ў гэтым накірунку можа ўключаць у сябе ясныя, добра бачныя і відавочныя мэседжы, якія тлумачаць місію Музея і важнасць яго працы (“Захоўваем тое, што не павінна знікнуць”).

Прадстаўнікі польскага грамадства. Для гэтай катэгорыі наведвальнікаў важна ясна бачыць, што Музей Вольнай Беларусі не асацыяваны з беларускім палітычным рэжымам і рэпрэзентуе альтэрнатыўную Беларусь. Музей можа выступаць для гэтых наведвальнікаў

як месца судакранання з гістарычна блізкай культурай народа, што заўсёды будзе суседнічаць з польскім грамадствам. Пажадана пры гэтым мець магчымасць дэманстрацыі супольных тэм і лёсаў, агульных балявых кропак праз адзінства гістарычных працэсаў. Такое пазіцыянаванне магчымае праз арганізацыю сумесных мерапрыемстваў, працу пастаянных і часовых выставаў, наяўнасць раздатачнага матэрыяла на пляцоўцы і інш.

Наяўнасць у Музеі экспазіцыі, што расказвала б пра гісторыю і культуру Беларусі, магла б істотна палепшыць працу з гэтай аўдыторыяй.

Прадстаўнікі іншых краін і культур.

Для гэтай катэгорыі наведвальнікаў Музей Вольнай Беларусі можа выступаць месцам знаёмства з спецыфікай актуальнай беларускай сітуацыі, а таксама, пры наяўнасці адпаведных магчымасцяў Музея – месцам знаёмства з беларускай гісторыяй і культурай. Варта ўлічваць, што другая функцыя вельмі важная, таму што вялікая частка гэтых наведвальнікаў з'яўляюцца неарганізаванымі, спантаннымі, якія зацікавіліся беларускім музеем як экзатычным элементам на культурным ландшафце Варшавы. Для працы з гэтай катэгорыяй, варта забяспечваць мерапрыемствы па паляпшэнні бачнасці – прысутнічаць на такіх сервісах, як Google-maps з актуальнай інфармацыяй, мець англамоўны этыкетаж, старонку сайта і запісы ў соцсетках. Таксама агульным задачам па працы з гэтай аўдыторыяй паспрыяла б наяўнасць матэрыялаў, што знаёмяць з Беларуссю, разлічаных на замежнікаў.

Што наконт онлайн-аўдыторыі. Уласнымі кропкамі камунікацыі і сродкамі пашырэння аўдыторыі з'яўляюцца сайт Музея freebelarus.museum і акаўнты ў сацыяльных сетках Instagram (2 731 падпісчык) і Facebook (769 карыстальнікаў). Статыстычныя даныя паказваюць, што пераважная частка аўдыторыі сацыяльных сетак Музея знаходзяцца ў Польшчы і ў Беларусі (лічбы могуць вагацца, на момант падрыхтоўкі матэрыяла яны паказваюць суадносіны 37,9% да 38,6% адпаведна ў Instagram, і 73,6% да 4,2% у Facebook). Буйнейшымі гарадамі, у якіх жывуць спажывальнікі кантэнта з'яўляюцца Варшава і Мінск (24,3% і 22% у Instagram). Акрамя Беларусі і Польшчы, у лік краін пражывання аўдыторыі ўваходзяць Украіна, Літва, ЗША, Германія, Італія, Чэхія, Расія, Бельгія, Францыя (па ўбыванні, ад 4,1% да 0,9%).

Праца з онлайн-аўдыторыяй павінна адпавядаць стандартам сучаснай інтэрнэт-журналістыкі і блогінга, з адпаведнымі мерапрыемствамі па забеспячэнні бачнасці і ахопу аўдыторыі і ўключаць у сябе прасоўванне публікацый на мэтавую аўдыторыю, працу дызайнера, SMM і SEO спецыялістаў.

6

# Партнёрства і супрацоўніцтва. Апякунская Рада

FREE BELARUS MUSEUM

Партнёрскія адносіны звязваюць Музей Вольнай Беларусі з шматлікімі беларускімі ініцыятывамі замежжа, актыўнымі ў сацыяльна-палітычнай і культурнай сферы.

Шматгадовыя партнёрскія адносіны звязваюць Музей як з заснавальнікамі, так і з іншымі палітычнымі інстытутамі беларускай эміграцыі – Аб'яднаны пераходны кабінет, Каардынацыйная Рада і іншыя. Пераважна, супрацоўніцтва з імі мае характар прадастаўлення інфраструктурных магчымасцяў з боку Музея для правядзення мерапрыемстваў.

Сярод арганізацый грамадскага сектара найбольш цеснае супрацоўніцтва назіраецца з Беларускай асацыяцыяй палітвязняў "Да Волі". Супрацоўнітва мае характар двухбаковых адносін, калі Музей прадстаўляе свае магчымасці для правядзення мерапрыемстваў і сустрэч, а асацыяцыя "Да Волі" дапамагае Музею вырашаць надзённыя патрэбы праз прадастаўленне паслуг валанцёраў і іншых рэсурсаў. Іншыя ініцыятывы, з якімі склаліся ўстойлівыя партнёрскія адносіны, прадстаўляюць разнастайныя культурніцкія праекты і сацыяльныя ініцыятывы, супрацоўніцтва з якімі носіць як устойлівы, так і перыядычны характар – Беларуская Рада культуры, Форум беларускіх культурніцкіх арганізацый, ПЭН, "Купалаўцы", "Вясна", Беларускі інстытут публічнай гісторыі, "MALDZIS", дударская школа, тэатральныя калектывы. Некаторыя з ініцыятыў маюць дамоўленасці з Музеем аб супрацоўніцтве на камерцыйнай аснове. Бачыцца, што дзеля забеспячэння фінансавай устойлівасці арганізацыі, Музею варта імкнуцца пашыраць віды паслуг, якія ён можа прадставіць іншым арганізацыям – гэта можа быць як арганізацыя мерапрыемстваў і арэнда абсталявання, так і спецыфічныя музейныя паслугі ў выглядзе арганізацыі экскурсій і выставак, экспазіцыйных праектаў, падрыхтоўкі музейных даведак і прадастаўлення экспертных паслуг. Адносіны з большай часткай пералічаных арганізацый не маюць фармальнага характару, колькасць заключаных паміж бакамі афіцыйных дамоваў невялікая. Фармалізацыя адносін у выпадку з маладой культурніцкай арганізацыяй, што знаходзіцца ва ўразлівым становішчы, можа быць адным з спосабаў дасягнення ўстойлівасці. Прапануем разглядзець магчымасць заключэння доўгатэрміновых партнёрскіх адносін з арганізацыямі, з якімі Музей звязвае шматгадовае супрацоўніцтва.

Асобную вартасць для Музея можа мець стварэнне Апякунскай Рады. Запрашэнне ў яе склад пастаянных партнёраў Музея – мецэнатаў, навукоўцаў і значных у грамадстве аўтарытэтаў у музейнай справе і культурніцкай дзейнасці, а таксама прадстаўнікоў уплывовых грамадскіх арганізацый, паспрыяе фармаванню вакол Музея надзейнага партнёрскага кола, што пашырыць магчымасці арганізацыі па пошуку інстытуцыянальнай устойлівасці.

Дзеля паспяховай рэалізацыі праграмы супрацоўніцтва з партнёрамі, рэкамендуем распрацаваць матрыцу супрацоўніцтва, якая будзе ўключаць:

Стратэгічных партнёраў (што даюць рэсурс/легітымнасць/напаўненне фондаў).

Праграмных партнёраў (па стварэнні сумеснага кантэнта).

Аперацыйных партнёраў (валанцёры; арганізацыі, што прадстаўляюць рэсурсы/тэхніку)

Камунікацыйных партнёраў (медыя).

Асобна варта адзначыць неабходнасць распрацоўкі стратэгіі па камунікацыі і супрацоўніцтве Музея з польскімі і замежнымі партнёрскімі арганізацыямі. Такая стратэгія магла б уключаць у сябе фарміраванне партнёрскага спіса арганізацый (напрыклад, Музей Варшаўскага паўстання, Музей Варшавы, Музей гісторыі польскіх яўрэяў POLIN, Нацыянальны музей у Варшаве, Еўрапейскі Цэнтр Салідарнасці ў Гданьску, а таксама музеі ў Падляшшы); распрацоўку праграмы сумесных мерапрыемстваў (сумесныя выставы, абмен досведам, праграмы стажыровак для беларускіх музейных спецыялістаў, сумесныя выдавецкія праекты); фармаванне плана па ўстанаўленні кантактаў з польскімі навуковымі цэнтрамі, якія займаюцца даследаваннямі Беларусі. Сярод замежных арганізацый, супрацоўніцтва з якімі мае для Музея Вольнай Беларусі стратэгічны характар, трэба выдзеліць Беларускую бібліятэку і музей імя Францыска Скарыны ў Лондане і Віленскі беларускі музей імя Івана Луцкевіча.

7

# Эканамічная мадэль функцыянавання музея

FREE BELARUS MUSEUM

На бягучы момант Музей Вольнай Беларусі, як ужо гаварылася, мае тры асноўныя крыніцы фінансавання. Гэта спонсарская падтрымка, што пакрывае прыкладна 40% патрэбаў, фінансаванне за кошт грантавых праграм (50%) і ўласныя даходы (10%).

Пры гэтым спонсарская падтрымка і ўласныя даходы закрываюць пераважна патрэбы Музея па арэндзе памяшканняў і аплаце камунальных паслуг, а таксама штодзённых побытавых патрэб і, часткова, мерапрыемстваў. Грантавая падтрымка забяспечвае магчымасці па ўтрыманні штатнай колькасці супрацоўнікаў і дазваляе забяспечваць фінансаванне на правядзенне ўласных музейных мерапрыемстваў – выставаў, прэзентацый, канцэртаў, круглых сталоў і інш.

Таксама Музей Вольнай Беларусі выкарыстоўвае такія формы дадатковага фінансавання, як збор данатаў (сістэма Stripe) і адлічэнні 1,5% з падаткаў ад падатковых рэзідэнтаў Рэспублікі Польшча.

План дыверсіфікацыі даходаў:

Пашырыць кола пляцовак для збору данатаў (разавыя/штомесячныя).

Увесці членскую праграму “сябры музея”.

Увесці продаж квіткоў на частку мерапрыемстваў.

Пашырыць камерцыйныя паслугі (арэнда, экскурсіі, рэклама)

Наладзіць продаж мерча/прадукцыі.

Актывізаваць аказанне платных паслуг.

8

# Маніторынг

FREE BELARUS MUSEUM

Маніторынг і ацэнка рэалізацыі дадзенай Стратэгіі разглядаюцца як пастаянная кіравальная практыка, якая дазваляе Музею Вольнай Беларусі захоўваць стратэгічны курс ва ўмовах зменлівага кантэксту эміграцыі, абмежаваных рэсурсаў і адначасовага выканання музейных і грамадска-культурных функцый.

З гэтай мэтай будзе ўведзена сістэма рэгулярнага адсочвання выканання стратэгічных задач на аснове гадавога аперацыйнага плана, які складаецца ў адпаведнасці з мэтамі Стратэгіі і ўтрымлівае канкрэтныя чаканыя вынікі, тэрміны, адказных і ключавыя паказчыкі эфектыўнасці. Асновай маніторынгу стануць як колькасныя, так і якасныя даныя, што адлюстроўваюць асноўныя напрамкі дзейнасці Музея: развіццё і ўлік калекцый, тэмпы і якасць алічбоўкі, стан і бяспека захоўвання, рэалізацыя выставачных і адукацыйных праектаў, ахоп і структура аўдыторыі, камунікацыйная бачнасць у польскім і міжнародным кантэксце, а таксама фінансавая ўстойлівасць і партнёрская сетка.

Збор інфармацыі для маніторынгу будзе ажыццяўляцца праз унутраную дакументацыю і ўліковыя сістэмы (інвентарны ўлік, рэестры паступленняў, улік выдаткаў і даходаў, праектныя справаздачы), праз базавы падлік наведванняў і ўдзельнікаў мерапрыемстваў, праз аналітыку сайта і сацыяльных сетак, а таксама праз зваротную сувязь ад наведнікаў, партнёраў і прафесійнай супольнасці. Пры гэтым будзе забяспечана адпаведнасць стандартам бяспекі і прыватнасці, праз мінімізацыю збора персанальных даных і захаванне магчымасці ананімнага водгуку, асабліва для ўразлівых груп аўдыторыі. Ацэнка вынікаў будзе адбывацца ў двух рэжымах: унутраным, калі каманда Музея на рэгулярнай аснове аналізуе прагрэс, выяўляе адхіленні, прычыны і карэкціруе план дзеянняў, і знешнім, калі па выніках года (альбо па завяршэнні ключавых этапаў) праводзіцца агляд дасягненняў і праблем з удзелам Апякунскай Рады, партнёраў і, пры магчымасці, незалежных экспертаў, што дазволіць умацаваць празрыстасць, давер і прафесійную якасць прынятых рашэнняў.

Вынікі маніторынгу і ацэнкі будуць фіксавацца ў кароткіх унутраных справаздачах, якія выкарыстоўваюцца для кіравання, планавання і фандрайзінгу, а таксама ў гадавым публічным аглядзе дзейнасці Музея, што прадстаўляе асноўныя паказчыкі, дасягненні, высновы і прыярытэты на наступны перыяд; такая практыка будзе спрыяць пераемнасці, устойлівасці і паступоваму пераходу Музея да больш сістэмных музейных стандартаў працы.

9

# Заключэнне

FREE
BELARUS
MUSEUM

Прадстаўленая Стратэгія развіцця Музея Вольнай Беларусі сфармулявана як адказ на ўнікальныя ўмовы існавання інстытуцыі ў эміграцыі і на спалучэнне некалькіх яе роляў адначасова: музея, культурніцка-асветніцкага і камунікатыўнага цэнтра, а таксама прасторы салідарнасці і грамадзянскай прысутнасці беларусаў у замежжы.

У аснове прапанаванага бачання – захаванне і музеефікацыя матэрыяльных сведчанняў беларускай барацьбы за свабоду і дэмакратыю, фармаванне і развіццё калекцый, іх дакументаванне, навуковая апрацоўка, належнае захоўванне і пашырэнне доступу да іх як праз выставачную працу, так і праз лічбавую прысутнасць. Адначасова Стратэгія падкрэслівае неабходнасць паступовага пераходу ад пераважна падзеявай, шматвектарнай мадэлі дзейнасці да больш сістэмнага музейнага фармату, які дазволіць умацаваць прафесійныя стандарты, знізіць рызыкі для калекцый і каманды, а таксама павысіць устойлівасць інстытуцыі ў сярэдне- і доўгатэрміновай перспектыве.

Дасягненне гэтых мэт немагчымае без умацавання матэрыяльнай базы, развіцця кампетэнцый і кадравага патэнцыялу, дыверсіфікацыі фінансавання і далейшай інстытуцыянальнай легітымізацыі ў польскім культурным асяроддзі праз партнёрствы, бачнасць і сумесныя праекты, якія робяць Музей зразумелым і патрэбным як для беларускай дыяспары, так і для польскай і міжнароднай аўдыторый.

Рэалізацыя палажэнняў Стратэгіі павінна суправаджацца рэгулярным маніторынгам і ацэнкай, каб захоўваць адпаведнасць місіі, адаптавацца да зменлівага кантэксту і ператвараць штодзённую працу ў паслядоўны рух да агульнай мэты – і захавання памяці і стварэння моцнай культурнай інстытуцыі, якая здольная працаваць для беларусаў сёння і стаць важным рэсурсам для будучай вольнай Беларусі.

FREE
BELARUS
MUSEUM

Варшава, 2026